vНовости

Общество
02.04.2025

# БДУІР далучыўся да Рэспубліканскай акцыі «Дай лесу новае жыццё!»

**Сёння, 2 красавіка, дэлегацыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі на чале з рэктарам Вадзімам Богушам высадзіла новыя саджанцы ў Валожынскім лясгасе Мінскай вобласці.**

Беларусь далучаецца да святкавання Міжнароднага дня лясоў і дае старт акцыі па аднаўленні ветравальна-бураломных участкаў «Дай лесу новае жыццё!» Акцыя, накіраваная на лесааднаўленне пасля разгулу леташняй ліпеньскай стыхіі, праходзіць у Беларусі з 21 сакавіка па 12 красавіка ўжо другі раз. Увосень мінулага года старт ініцыятыве Мінлясгаса даў асабіста Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, пасля чаго ініцыятыву падхапілі ўсе вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі міністэрстваў, камітэтаў, канцэрнаў і ведамстваў.

Сімвалічна, што на гэты раз акцыя пройдзе пад эгідай Года добраўпарадкавання і 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Лесапасадкі будуць арганізаваны па ўсёй краіне, але Міністэрства лясной гаспадаркі заклікае валанцёраў аказаць сваю дапамогу па магчымасці Гомельскай або Магілёўскай абласцям, якія найбольш пацярпелі ад разгулу стыхіі. Падчас акцыі студэнты, курсанты ды супрацоўнікі пасадзілі больш за тысячу саджанцаў хвоі. Перад лясной гаспадаркай стаіць задача не толькі аднаўляць лясны фонд, але і даносіць людзям, што лес патрабуе беражлівых адносін.

Разам з супрацоўнікамі і студэнтамі ўніверсітэту маладыя ялінкі пасадзілі навучэнцы і адміністрацыя сярэдняй школы №209 г.Мінска.

*«БДУІР ужо шмат гадоў удзельнічае ў аднаўленні лесу. Гэта добрая нагода папрацаваць на зямлі і паказаць стаўленне да таго месца, дзе мы жывём, бо саджанцы - будучыня нашых дзяцей. Высаджваючы дрэвы, мы закладваем падмурак для будучых пакаленняў. Прыродныя рэсурсы трэба ўвесь час аднаўляць. Пры слушным клопаце, зямля дасць нам свае багацці:*

*свежае паветра, драўніну, экалагічна чыстыя прадукты»*, - падзяліўся рэктар БДУІР **Вадзім Богуш**.






BSUIR
BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR


ПЕРВЫЙ!
BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR


CAICOM
BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR


BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR BSUIR







Падрыхтавана прэс-службай
Фота Андрэя Сіняўскага